СУЧАСНАЯ ПРОЗА

Зінаіда ДУДЗЮК

# Дом для адзінай

Раман

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2025

УДК 821.161.1(476)-3
ББК 84(4Беи)6-44
Д81

*Серыя заснавана ў 2024 годзе*

**Дудзюк, З. І.**
Д81 Дом для адзінай : раман / Зінаіда Дудзюк. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2025. — 260 с. — (Серыя «Сучасная проза»).
ISBN 978-985-581-737-7.

Міхалка Дубровіч сустрэў Хрысціну і закахаўся з першага позірку. Вырашыў пабрацца з дзяўчынай, але яго маці Аксіння не хацела мець за нявестку сірату без пасагу. Тады маладыя пачалі жыць без благаславення бацькоў. Аксіння ж заклялася, што не пераступіць парог іхняй хаты. Аднак пасля нараджэння трэцяй унучкі ўсё ж змірылася, пайшла да сына. А на другі дзень здзейсніўся заклён…

Сям'і Міхалкі давялося перажыць яшчэ шмат выпрабаванняў у гады калектывізацыі, Другой сусветнай вайны і пасляваеннага ліхалецця. Дзеці выраслі, разляцеліся ў пошуках шчасця, але і над імі нязменна вісеў праклён…

Раман «Дом для адзінай» — пра каханне і нянавісць, пра веру і здраду, пра барацьбу дабра са злом, пра здольнасць чалавека ратавацца ў самых невыносных умовах…

**УДК 821.161.1(476)-3**
**ББК 84(4Беи)6-44**

**ISBN 978-985-581-737-7**

© Дудзюк З. І., 2025
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2025

# 1

Хлопец вяртаўся з вайны, на плячы нёс амаль пусты заплечнік. Ногі, абутыя ў чаравікі і абматаныя анучамі, бадзёра абміналі лужыны. Полы шыняля ён падгарнуў пад пасак, каб не мачыліся. Снегу сёлета было шмат, але да гэтага часу амаль увесь паспеў растаць, толькі там-сям пад платамі ляжалі яшчэ пачарнелыя гурбачкі, дажывалі апошнія дні, зліваліся з зямлёю. Гледзячы на іх, былы франтавік міжволі прыгадаў сваіх палеглых аднапалчан, якія гэтак жа недзе ператвараюцца ў прах без трунаў, а найчасцей і без магіл. Забітыя ці атручаныя газам, яны засталіся ляжаць далёка ад родных мясцін. Шмат разоў кляўся не ўспамінаць жахі вайны, а яны зноў і зноў паўставалі ў памяці. Цешыла тое, што яму пашанцавала выжыць, і цяпер вяртаўся да бацькоў, а таму хацеў, каб і галава ягоная стала такою ж пустою, як заплечнік: нічога і нікога не згадваць, ні пра што не шкадаваць, ні ў чым сябе не вінаваціць. Карцела хутчэй абняць родных, нацешыцца спакоем, заняцца звычайнаю сялянскаю праваю. Паабяцаў сабе, што першага сустрэчнага вяскоўца абдыме і пацалуе ад радасці толькі за тое, што атрымае прывітанне на роднай гаворцы. Бацька пісаў, што сястра Хадоска выйшла замуж за хлопца з Рудні, там і жыве з ім, а самая старэйшая Гарпіна не спяшаецца, усё перабірае, сватоў адпраўляе ні з чым, мабыць, даседзіцца, што ўрэшце застанецца старою дзеўкаю. Паведамляў таксама і пра малодшых брата Алёшу і сястру Таню, што яны прыкметна падраслі і дапамагаюць па гаспадарцы. На франтавых мітынгах розныя агітатары абяцалі, што людзям раздадуць панскую зямлю. Цікава, ці будзе што рабіцца ў родных Чаплічах, ці гэта толькі абяцанкі-цацанкі?

Дарога да бацькавай хаты пралягала праз вёскі, што выцягнуліся на высокім правым беразе Дняпра. На шчасце, сюды вайна не

дакацілася. На вокнах красаваліся вазоны, былі бачныя накрухмаленыя фіраначкі з марлі, але двары заставаліся непраглядныя з-за высокіх варот на магутных шулах і з такімі ж высокімі весніцамі. Вёскі перацякалі адна ў адну, хіба толькі тутэйшыя жыхары і ведалі, да якога павета прылічана тое ці іншае селішча. Недзе далёка, за сотні кіламетраў, у расійскіх гарадах віравала жыццё, руйнаваліся старыя парадкі. Ва ўсіх на вуснах было слова «рэвалюцыя», хоць сярод салдатаў мала хто разумеў, што гэта за падзея такая адбылася. Прыходзілі на фронт агітатары, абяцалі людзям зямлю, волю і рай на зямлі, пасля з’язджалі, а салдаты заставаліся сядзець у акопах і весці доўгую вайну, якая аднолькава набрыдла нямецкаму і расійскаму войскам. З двух бакоў фронту без дазволу генералаў выходзілі салдаты братацца, абменьваліся нейкай дробяззю. Здарылася нагода, што ў германцаў стала зусім блага з харчамі, пэўна, своечасова не падвезлі, тады ўдалося Міхалку выменяць у немца за бохан хлеба выдатную брытву, якою ён з задавальненнем галіўся.

За гэтымі міжвольнымі думкамі-згадкамі хлопец амаль дайшоў да першай хаты сваёй вёскі, тут і сустрэлася яму дзяўчына, што несла вёдры на каромысле. Хлопец яе не пазнаў, падумаў, мабыць, нечая дачка падрасла, пакуль ён ваяваў, але гукнуў весела:

— Здарова была, зямлячка! Чыя будзеш?

— Добры дзень, Паўлава сястра, — паказала яна ў бок хаты свайго родзіча.

— Чаму я цябе раней не бачыў?

— Жыву ў старэйшай сястры ў Засеках.

Хлопец параўняўся з дзяўчынаю, зірнуў у мілавідны твар, у шэрыя вочы, але пацалаваць не адважыўся, а яна між тым патлумачыла:

— Паўлава жонка дачку нарадзіла, дык мяне паклікалі памагчы парадзісе пакуль акрыяе.

— Дазволь спытаць, як завуць цябе?

— Хрысціна, — адказала яна і апусціла вейкі, быццам засаромелася, што спынілася і размаўляе з чужым чалавекам.

— А я — Міхалка Дубровіч. Цяпер будзем знаёмыя.

— З вайны вяртаешся? — са спагадай спытала яна.

— Адтуль… Няхай яна спрахне! Канца ёй не бачна, немцы зноў краіну апанавалі.

— З нашых Засекаў шмат хлопцаў загінула. А табе няхай і надалей шчасціць, — сказала яна і пайшла, асцярожна ступаючы, каб не расплёсквалася вада з вёдраў.

— І табе шчасця, дзякую, што з поўнымі перайшла дарогу, — адказаў ён наўздагон, разважаючы, што намерваўся пацалаваць першага сустрэчнага вяскоўца, хто б там ні быў, дзядзька ці цётка, а сустрэлася незнаёмая дзяўчына — і не адважыўся здзейсніць задуму, цяпер шкадаваў і ўшчуваў сябе за нерашучасць.

Хрысціна несла ваду з-пад гары, менавіта там вяскоўцы капалі калодзежы, бо каля Дняпра было шмат крынічак. Міхалку раптам пацягнула да ракі, тут усяго сотня крокаў улева. Хлопец звярнуў на тую сцежку, па якой толькі што прайшла дзяўчына, мінуў чужы агарод і апынуўся ля бярозак, якія ўзбеглі на вяршыню гары. Адсюль было добра відаць раку і зарэчча. Ажно дыханне перахапіла ад хвалявання і радасці: два гады не выходзіў на гэты бераг. І вось ён, Дняпро, ва ўсёй сваёй невыказнай велічы! Разліўся так, што затапіў старыцу і востраў, толькі там-сям былі бачны верхнія галінкі лазы над вадою. Рака ляжала спакойная, стомленая, чакала сонца, цяпла, каб заззяць у промнях, засвяціцца. Але дзень выдаўся пахмурны, таму і вада выглядала шэрай. За ракою сінеў далёкі лес, з гары добра раскрывалася прастора, аднак вёсак не было відаць. А недзе ж там жыве сястра Хадоска і нават не здагадваецца, што зараз брат думае пра яе і спрабуе ўявіць, як яна пачуваецца ў ролі жонкі. Ён прайшоў па гары, мінаючы высокія кусты ляшчыны і старую дзікую грушку. Наплылі ўспаміны, як у маленстве шнырыў тут з сябрукамі Пецем і Сцёпам у пошуках лузанцаў, ажын, іншы раз і краснагаловіка якога ўдавалася адшукаць пад бярозкамі. Цяпер дрэвы і кустоўе яшчэ былі голыя, а таму здаваліся бездапаможнымі і кволымі. Але ён ведаў, што праз які месяц усё тут зазелянее, зацвіце, зямля прачнецца для жыцця і красавання.

Не хацелася адыходзіць ад ракі, здаецца, стаяў бы тут да ночы, назіраў за наваколлем, але ж карцела хутчэй убачыць родных. Ён вярнуўся ў вёску. На вуліцы было пуста, толькі куры дзе-нідзе грэбліся каля двароў, ды выбег насустрач калматы сабачка і не звярнуў увагі на хлопца. «Куды ўсе падзеліся? — спытаў сам у сябе

і знайшоў адказ. — Вядомая справа, гной варочаюць у хлявах. Хутка павязуць на поле». Падумаў так і адчуў, як усё цела прагне працы да стомы, да знясілення, замаркоцілася, седзячы ў акопах. Нават і нямецкага атрутнага газу ўдалося паспытаць, але быў ён салдат паслухмяны, усё рабіў, як загадвалі камандзіры, не рызыкаваў, пры першай небяспецы нацягваў процівагаз, таму і выжыў. Нагледзеўся на пасінелыя трупы смельчакоў, якія не верылі, што нейкі саладкаваты ружовы дымок можа забіць.

Лічаныя крокі засталіся да родных весніц. Вось вялізны куст бэзу ў гародчыку, а за ім — родная хата. Двор пераадолеў за некалькі шырокіх і паспешных крокаў, ускочыў у цёмныя сенцы, адчыніў дзверы ў хату, убачыў бацьку, які, седзячы каля грубкі, плёў кош. Маці на лаве каля акна вязала нешта на прутках, першая заўважыла сына, радасна ўскрыкнула і кінулася насустрач, прыгаворваючы:

— Вярнуўся! Вярнуўся мой Міхалачка! — размазвала па твары слёзы радасці.

Тут ужо і бацька падняўся з зэдліка, адхіліў жонку, падаў руку сыну, абняў, прамармытаў:

— Парадаваў, парадаваў… Мы ўжо тут не ведалі, што думаць. Лістоў няма, ды і паштары не працуюць, быццам жыццё спынілася.

Сын і бацька стаялі насупраць адзін аднаго, высокія і зграбныя, толькі Міхалка танклявы па-юначы, а Мірон шыракаплечы, магутны, як волат, з пышнаю сіваватай барадой і такою ж густою кучмаю хвалістых валасоў на галаве.

— Дык рэвалюцыя, тата, здарылася. Яшчэ вайна з немцамі толкам не скончылася, а ўжо, кажуць, грамадзянская пачалася. Дзякаваць Богу, адпусцілі жывога дадому.

— І добра зрабіў, што вярнуўся! Няма чаго шукаць прыгод на галаву. Няхай ваююць, каму шмат трэба, а мы маем кавалак зямлі, які нас корміць.

— Які ж худзенькі і змарнелы, — завяла скрозь слёзы маці.

— Абы жывы! Распранайся, прысядзь з дарогі, — прапанаваў бацька.

Міхалка кінуў у парог заплечнік, сцягнуў шынель і павесіў на кручок каля дзвярэй, удыхнуў на поўныя грудзі знаёмыя пахі, здалося, што ажно ў галаве завадзіла, сеў на лаву.

— Як жа ты дабіраўся, сынок, немцы, кажуць, зноў аселі ў Гомелі і ў Рэчыцы? — спытала маці.

— Гэта якраз і дапамагло. Немцы наладзілі чыгуначны рух, стараюцца найболей чаго вывезці. Дык я і даехаў на дахах таварнякоў, спачатку — да Мінска, пасля — да Гомеля, а стуль ужо пешкі прыдыбаў.

— І ніхто цябе не затрымаў? — здзівіўся бацька.

— А за што мяне затрымліваць? Зброі пры сабе не маю, а што ў вайсковым адзенні, дык цяпер палова краіны так апранутая.

— Божа мой, колькі бяды на долю нашаму дзіцяці выпала, — зноў заплакала маці.

— А як вы тут жылі? Агітатары на фронце абяцалі людзям зямлю, — пацікавіўся сын.

— Мы пра той дэкрэт таксама чулі, — пасміхнуўся бацька. — Некаторыя рызыканты нават кінуліся дзяліць зямлю пані Бараноўскай, вешкі паставілі, аднак усё дарма. Ты ж чуў, мабыць, што наш уезд немцы далучылі да Украіны, цяпер хахлы кіруюць. Дык і мы хахламі мусім быць на сваёй зямлі ды са сваёю гаворкаю. Улады часта мяняюцца, але кожная ходзіць і патрабуе хлеба, мяса, масла ды сена коням.

— Усялякае войска есці хоча. У каго зброя, у таго і сіла. Як хочуць краіну дзеляць, — уздыхнула маці.

Раптам дзверы шырока расчыніліся, і ўбеглі сёстры з братам, павіслі на Міхалку, абцалавалі, ускудлацілі валасы.

— А я заўважыла, быццам нехта чужы пайшоў у наш двор, калі з Клаўкаю гуляла. Паклікала Гарпіну з Алёшам з хлява, яны там гной дзяўблі, — пахвалілася малая Таня.

— Ого, якая ты вырасла! — здзівіўся Міхалка, паглядаючы на малодшанькую сястру, якая мела гадоў пяць ад роду, падхапіў яе на рукі. — Хутка мяне дагоніш!

— Даганю, — паабяцала малая і абняла брата за шыю, наколькі хапіла дзіцячае сілы.

— Прабачце, родныя, ніякіх гасцінцаў вам не прывёз. Там, дзе быў я, крамы не працуюць, дзяржава кашу дарэмуную варыць і хлеб раздае. На гэтым яе ласка канчаецца.

— Ты для нас — найлепшы гасцінец! Калі не надта галодны, дык мыйся, апранайся ў цывільнае адзенне і пачынай новае жыццё. Калі ж есці хочаш, маці пакорміць, — прапанаваў бацька.

— Дзякую, спярша хачу ў лазню.

Міхалка нават і не ведаў, галодны ён ці сыты. Душу напоўніла радасць сустрэчы, хацелася глядзець на родных, слухаць іхнюю гаворку, распытваць пра навіны ў вёсцы, а найбольш карцела як мага хутчэй змыць з сябе франтавыя ўражанні, боль страт і страх смерці, якія штодзённа віселі над кожным вайскоўцам.

— У такім разе пайду натаплю лазню, а ты рыхтуйся, — сказаў бацька і пайшоў з хаты.

— Сыночак, ты і не ведаеш, мабыць, што твае сябрукі Пецяі Сцёпа палеглі на той вайне. Іхнія маткі так ужо галасілі, як атрымалі паведамленні аб смерці. А найбольш шкадавалі, што не маюць іхнія дзеці магіл. Дзе іх сырая зямля прыняла, невядома. З жывымі не нацешыліся і з мёртвымі не пагавораць.

— Так, мама, шмат людзей скасіла вайна. Пецю і Сцёпу шкада. Зямля ім пухам і царства нябеснае. Даваеннае жыццё мне ў акопах райскім здавалася, — адказаў Міхалка і зірнуў на аціхлых сясцёр і брата. — А вы як пажываеце?

— Звычайна ў нас, — азваўся баском шаснаццацігадовы Аляксей. — Я з татам па дровы ездзіў, лазу нарыхтоўваў. Гарпіна з Таняй маме дапамагаюць.

— А я цэўкі навівала, калі мама на кроснах ткала, — паведаміла Таня.

— Малайчына, — Міхалка прыгладзіў трохі раскудлачаныя валасы чарнявай Тані і падумаў, што малая знешне ўдалася ў маці.

— Такіх майстрыц, як нашы Хадоска ды Гарпіна, яшчэ трэба пашукаць, — не стрывала, каб не пахваліцца дочкамі маці.

— А як наша Хадоска жыве? — спытаў Міхалка.

— Добра, муж яе, Рыгор, — чалавек працавіты, хату будуе. Прыгожая ў іх там мясцовасць. Кругом лес, грыбоў багата ды чарніц, сажалку выкапалі, рыба водзіцца. Спакойная я за яе, а вось Гарпіна мяне турбуе, — пажалілася маці.

— Чаго ты, мама, усё на мяне нагаворваеш? — азвалася Гарпіна.

— Нельга было, каб Хадоска, маладзейшая за цябе, ішла замуж першая.

— Набудуся яшчэ за тым замужам, мне і тут няблага.

— Дзіва што за бацькавай спінаю…

У хату ўвайшоў гаспадар — і спрэчка спынілася.

— Ідзі, сынок, — лагодна сказаў ён, — лазня гатовая.

— Дзякую, — адказаў Міхалка, і ажно сэрца соладка зашчымела ад бацькавай дабрыні, ад радасці сустрэчы з маці, братам і сёстрамі, ад адчування сваёй прыналежнасці да гэтай сям'і, дзе тата, высокі і дужы, строгі і клапатлівы, дзе мама, хударлявая і кволая, але можа быць непахіснаю і адначасова непамерна ласкаваю. Характары сваіх бацькоў ведаў добра, але і сам меў такі ж упарты нораў, а іншы раз сентыментальны.

## 2

Міхалка толькі адзін дзень палайдачыў, пабыў госцем у роднай хаце, а пасля ўцягнуўся ў працу, як усе сямейнікі. А турбот вясновых хапала ўсім: выдзіралі гной з хлява, складвалі ў кучу, пасля вазілі на агарод і на поле, раскідалі, аралі загоны, рыхтаваліся да пасеву. Што б ні рабіў хлопец, а думкамі вяртаўся чамусьці да нечаканай сустрэчы з Хрысцінай, адчуваў, што патрэбна яму яшчэ пабачыцца з ёю. Наведацца да яе брата Паўла не адважваўся, баяўся паставіць у няёмкае становішча дзяўчыну, ды і самому ніякавата было заявіцца ў чужую хату без папярэдняй дамоўленасці. Нават хадзіў на вячоркі з Гарпінаю. У скокі не кідаўся. Да вайны гэтаму штукарству не навучыўся, а цяпер быццам і позна, ён жа не які блазнюк, а дарослы мужчына. Гарпіну хлопцы на польку не запрашалі (у вёсцы дзяўчына, якой было трохі за дваццаць, лічылася старою), але яна не гублялася, а вытанцоўвала з кім-небудзь з сяброўак. Хоць, безумоўна, усе ведалі, якая яна майстрыца працы, ткаць і вышываць, таму шмат хто з вясковых цётак, можа, хацелі б займець яе за нявестку, але ўсім сватам адмаўляла Гарпіна, чакала некага да сэрца. За той час, пакуль Міхалка быў на вайне, падрасло шмат маладзенькіх і прывабных дзяўчатак, якія з малых гадоў шчыльна далучаліся да працы, а таму ў чатырнаццаць гадоў выглядалі ўжо як дарослыя, апраналіся ў вышыванае даматканае адзенне, на фарбу сялянкі сваім дочкам не скупіліся, ажно стракацела ў вачах ад гожых убораў. Шкада толькі, што большасць была абутая ў лапцікі, а некаторая малеча і зусім босая, мабыць, з'явіліся

сюды без дазволу мацярок. Пастаяў Міхалка, паўзіраўся ў гэты гармідар, перакінуўся словам з хлопцамі, але з-за гармоніка і бубна нават уласнага голасу не было чуваць, таму ніхто асабліва да гаворкі не імкнуўся. Больш бойкія хлопцы, аматары паскакаць, кідаліся ў гурт дзяўчат, выцягвалі стуль за руку на круг якую прыгажуню і апантана пачыналі мясіць дол нагамі, астатнія стаялі ўбаку, пакурвалі ды азіралі прысутных, прымерваліся, якую кралю правесці дахаты з вячорак. Міхалка ўсё чакаў, можа, з'явіцца Хрысціна, але дарэмныя былі ягоныя спадзяванні. Да яго прыбілася Гарпіна, разгарачаная пасля полькі, спытала задыхана, абмахваючыся хусткаю:

— Чаго стаіш слупом? Ідзі паскачы з якою.

— Я ж не казёл, каб скакаць, — пасміхнуўся Міхалка. — Адскакаў і адпоўзаў на вайне. Не цікава мне гэта. Прабач, пайду дахаты, заўтра рана ўставаць.

— А як жа ты жаніцца будзеш? Трэба дзяўчыну нагледзець.

— Дасць Бог, неяк ажанюся, паспею той хамут на шыю ўздзець. Бачыш, колькі тут дзяўчат, як гароху, выбар вялікі, ажно вочы разбягаюцца, а хлопцаў мала.

— Хлопец і ў сорак гадоў сабе пару падбярэ, а дзяўчына такой магчымасці не мае.

— Дык падбірай сабе тут пару, а мне да сарака гадоў часу яшчэ шмат, — засмяяўся Міхалка, — узмахнуў рукою на развітанне і пашыбаваў дамоў, думаючы пра Хрысціну.

Сам не заўважыў, як гэтая дзяўчына пасялілася ў ягонай душы, захапіла ўсе яго думкі. Згадваліся яе ясныя вочы, цёмныя валасы, расчасаныя на роўны прадзел, тоненькая постаць, мілы твар, ціхі прыемны голас. Здавалася, зроду не сустракаў прыгажэйшай дзяўчыны. Разважаў, куды яна магла падзецца, чым займаецца, што не знаходзіць магчымасці хоць які вечар пабыць сярод моладзі?

Спраў у гаспадарцы набіралася ўсё больш, пасля пачаўся пост перад Вялікаднем, пра весялосць трэба было часова забыць, усе чакалі свята. Спадзяваўся на гэтыя яскравыя дні і Міхалка. Адчуваў, што недарма паслаў Бог яму сустрэчу з Хрысцінай, напэўна, меў нейкія намеры, і не можа быць, каб не знайшлося магчымасці пабачыцца з ёю зноў.

З вечара перад усяночнаю службаю прыбраўся Міхалка ва ўсё святочнае, прычасаў рыжаваты чуб, падстрыг вусы, якія яшчэ на

вайне адгадаваў па прыкладзе старэйшых ваяк, і выправіўся ў царкву. Аляксей таксама падахвочваўся ісці з ім, але Міхалка пераканаў малодшага брата, што яму лепш паехаць з бацькамі, яны раней вернуцца са службы, а Міхалка мае намер сустрэцца з ацалелымі хлопцамі, з якімі ішоў на вайну, каб пагутарыць ды паўспамінаць.

Царква была ў Холмечы. Па дарозе Міхалка прыглядаўся да дзяўчат і жанчын, шумлівыя гурты якіх раз-пораз абганяў, бо ногі меў доўгія, таму крокі рабіў шырокія. Іншыя гаманкія асобы спрабавалі яго зачапіць, маўляў, далучайся, з намі весялей. Ён аджартоўваўся, што баіцца адтаптаць іхнія босыя ногі. Дзяўчаты шанавалі абутак, хоць было яшчэ золка, шыбавалі басанож, несучы чаравічкі, завязаныя ў хусткі.

У царкву набілася поўна людзей, разгледзець там Хрысціну не было ніякай мажлівасці, між тым Міхалка меў цвёрдую перакананасць, што сёння абавязкова сустрэне яе. Адстаяў службу, хоць было душна, памаліўся, каб не размінуцца з мілаю дзяўчынаю. І, падобна было на тое, што Бог пачуў ягонае жаданне. Пад раніцу, калі ўсе вернікі разам са святаром высыпалі на дзядзінец і сталі ў два даўжэзныя радочкі, каб пасвяціць свае кошыкі з прыпасенымі харчамі, толькі тады нарэшце ўбачыў Міхалка Хрысціну, ажно сэрца заскакала вясёлым мячыкам. Стаяў зводдаль і чакаў, калі дойдзе да яе чарга атрымаць асвячэнне з папоўскага крапідла, а яшчэ баяўся, каб яна якіх сяброўак не набрала сабе ў спадарожніцы. Асцерагаўся лішні раз трапляць на вочы бацькам, яны таксама былі тут, але, на шчасце, стаялі на другім канцы гэтага зборышча. Пасля таго як пасвяцілі змесціва сваіх кошыкаў, людзі пачыналі патроху разыходзіцца. Хрысціна таксама скіравалася да брамкі. Міхалка падаўся за ёю, згледзеў, што яна нікога не чакае, не азіраецца, пашыбаваў услед, дагнаў на вуліцы і радасна сказаў:

— Хрыстос уваскрос, Хрысцінка!

Яна павярнула да яго здзіўлены твар, а калі пазнала, дык адказала:

— Сапраўды ўваскрос!

— Дык пахрыстосаемся, — прамовіў Міхалка ўсхвалявана і, не чакаючы згоды, тройчы цмокнуў дзяўчыну ў шчокі.

Яна заружовілася, засаромелася, пачала азірацца, але хрыстосаванне на Вялікдзень — справа звычайная, ніхто на іх не звярнуў

**Дудзюк Зінаіда Іосіфаўна**

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Свет убачылі болей за два дзясяткі кніг дакументальнай і мастацкай прозы, у тым ліку раманы: «Год 1812» (2004), «Кола Сварога» (2006), «Велясіты» (2010), «Гонка за ваўком» (2012), «Слодыч і атрута» (2013), «Лаза» (2016), «Гонды» (2018), «Паляванне зграяй» (2022), «Сыны Рарога» (2024), «Кошт волі» (2024, публікацыя ў часопісе «Маладосць»), а таксама некалькі зборнікаў драматычных твораў і кніжак казак для дзяцей.

Творчая праца Зінаіды Іосіфаўны адзначана Нацыянальнай літаратурнай прэміяй, ганаровым знакам «За вялікі ўклад у літаратуру», а таксама шматлікімі граматамі і дыпломамі. Яна ўзнагароджана бронзавым дыпломам Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Лепшая кніга года» (Германія, 2024), дыпломамі «Гран-пры» ў рэспубліканскіх конкурсах за раман «Паляванне зграяй» (2022) і за зборнік вершаў «Пуцявіна» (2024); прэміямі У. Калесніка і Беларускага прафсаюза работнікаў культуры. З’яўляецца пераможцай II Рэспубліканскага гумарыстычнага конкурсу «Папяровы бусел–2021», конкурсу, прысвечанага 70-годдзю Перамогі, за кнігу «Выжыць на дарозе смерці» (выдавецтва «Чатыры чвэрці»).